# Экскурсіўны маршрут “Сцежкамі святых ускраін Лагойскага і Вілейскага раёнаў”

***Аўтары:*** вучні дзяржаўнай ўстановы адукацыі “Крайская сярэдняя школа Лагойскага раёна”

***Кіраўнік:*** Цалабанаў Аляксандр Іванавіч, настаўнік матэматыкі і інфарматыкі.

***Мэта экскурсіі:*** фарміраванне ў вучняў грамадзянска-патрыятычных і духоўна-маральных якасцяў праз далучэнне да гісторыка-культурных каштоўнасцей роднага краю.

***Задачы:***

- знаёмства з хрысцыянскімі святынямі ўскраін Вілейскага і Лагойскага раёнаў;
- выхаванне духоўнай культуры дзяцей і падлеткаў, любові да роднага краю, павагі да гісторыі і культуры сваёй малой радзімы;
- шырокае далучэнне вучняў да культурнапазнавальнай і даследчай дзейнасці, накіраванай на пошук і атрыманне новых ведаў аб гісторыка-культурных і культавых каштоўнасцях малой радзімы.

***Тып экскурсіі:*** гістарычная

***Від экскурсіі:*** аўтобусна – пешая

***Працягласць экскурсіі:*** 5,5 гадзіны

***Даўжыня маршрута:*** 58,5 км

***Маршрут экскурсіі:***: в. Крайск – в. Альковічы– в. Мацькаўцы – в. Стайкі – в. Альковічы – в. Старынкі – в. Камена – аг. Даўгінава – аг. Крайск .

## *Змест экскурсіі*

У час экскурсіі яе ўдзельнікі пазнаёмяцца з легендай і гісторыяй вёскі Крайск, яе знакамітымі землякамі, гісторыяй сям'і Ж. Алфёрава; наведаюць царкву Свяціцеля Мікалая і Царскіх Пакутнікаў, пабываюць ў Альковіцкім касцёле ( помнік архітэктуры, пабудаваны ў неагатычным стылі ў1897—1902. Храм уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь). У музеі пры касцёле сабраны багаты матэрыял рэчаў нашых продкаў, убрання святароў, упрыгожанага элементамі слуцкіх паясоў.

Экскурсанты наведаюць адрэстаўрыраваны двор "Стайкі", які належаў роду Багдановічаў з 1-ай паловы 18 стагоддзя. У іх будзе магчымасць наведаць дзве самыя галоўныя каштоўнасці аг. Даўгінава: Траецкую царкву ( 1870 г.), цікавы помнік ретраспектыўна-рускага стылю і касцёл святога Станіслава пабудаваны ў 1853 годзе, які з тых часоў ні разу не закрываўся. У в. Даўгінава да нашага часу захаваўся будынак сінагогі, у якой вучыўся знакаміты беларускі пісьменнік Змітрок Бядуля. Побач са старымі яўрэйскімі могілкамі знаходзіцца адзіны захаваны ў Беларусі бейт-ахарон (хата абмыванняў). Тут перад пахаваннямі людзі з пахавальнага братэрства «Хэўра-Кадыша» абмывалі нябожчыка.

Пад час экскурсіі ў Цэнтр верхавой язды (в.Старынкі) удзельнікі змогуць пакатацца на конях і ўбачыць шматлікую колькасць розных экзатычных птушак пры наведванні агратурыстычнага комплексу "Райск".

Жадаючыя, змогуць перакусіць у летнім кафэ ў Даўгінава (Крайску) у агратурыстычным комплексе "Райск".

## *Агульныя метадычныя ўказанні да тэмы экскурсіі:*

- экскурсавод павінен мець веды пра гісторыю вёсак, святыя мясціны і храмы ;
- мэтазгодна пры сабе мець "партфоліа экскурсавода";

- экскурсія павінна весціся ў адпаведнасці з патрабаваннямі дыферэнцыяванага падыходу;
- для пашырэння зрокавага раду, павышэння эфектыўнасці экскурсіі варта выкарыстоўваць наглядны матэрыял: (збудаванні, сажалкі, помнікі, рэшткі паркаў і г. д.).

## *Агульныя арганізацыныя ўказанні:*

у час правядзення экскурсіі строга выконваць правілы бяспекі ўдзельнікамі экскурсіі, правілы дарожнага руху, інструктаваць экскурсантаў аб выкананні норм бяспекі пры аглядзе аб’ектаў: збудаванняў і водных сістэм.

## *Уступ да экскурсіі:*:

- арганізацыйны ўступ зрабіць пры сустрэчы з групай да пачатку руху, прыгадаць групе сваё імя і імя па бацьку, абгаварыць неабходныя арганізацыйныя пытанні і нагадаць пра правілы паводзін падчас экскурсіі і нормах бяспекі;
- у інфармацыйнай частцы ўступу коратка паведаміць пра тэму і асноўныя аб'екты экскурсіі;
- настроіць экскурсантаў на ўспрыманне зместу экскурсіі і ўстанавіць з імі эмацыйна-псіхалагічны кантакт.

***Працягласць уступа*** – 5 хвілін.

***Заключэнне***: заключэнне зрабіць пасля наведвання агратурыстычнага комплексу “Райск”.

***Працягласць заключэння:*** – 5 хвілін.

# *ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА МАРШРУТА ЭКСКУРСІІ*

| Маршрут | Месца астаноўкі | Аб’ект паказу | Працяг-ласць, мін | Найменаванне падтэмы | Арганізацыйныя пытанні | Метадычныя ўказанні |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Уступ 5 мін** | | | | | | |
| в. Крайск | в.Будзённага 5 пляцоўка каля школы | Школьны музей “Спадчына” | 20 | Гісторыя в.Крайск, знакамітыя людзі вёскі | Прапанаваць групе размясціцца паўкругам | Сустрэча і кароткае знаёмства з групай. Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд і аповед) экскурсійная даведка . |
| | Пяшком, 100 м ад школы | Помнік “Скорбящий воин” | 5 | Помнік скульптара Селіханава. Звесткі аб устаноўцы помніка, партызанскім руху брыгады “Народныя мсціўцы” імя Варанянскага | Прапанаваць групе размясціцца паўкругам | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд і аповед) экскурсійная даведка . |
| | Пяшком, 50 м ад помніка | Царква Свяціцеля Мікалая і Царскіх Пакутнікаў. Помнік цару Мікалаю | 20 | Гісторыя адраджэння храма. Звесткі аб устаноўцы помніка | Экскурсію праводзіць святар па дамоўленасці | Выкарыстоўваць прыёмы паказу (папярэдні агляд і аповед) экскурсійная даведка . |
| **Пераезд у вёску Альковічы Вілейскага раёна (7 км, 8 хвілін)** | | | | | | |
| в. Алько-вічы | Плошча ля касцёла | Касцёл “ Адведзіны Найсвяцейшай панны Марыі”, музей пры касцёле | 30 | Знешні і ўнутраны агляд храма, знаёмства з будовай, з мастацтвам храма, наведванне музея пры касцёле. | Экскурсію праводзіць святар па дамоўленасці | Знаёмства з правіламі паводзін у час экскурсіі ў храме, па-радку руху, размя-шчэння і парадаку агучвання пытанняў да экскурсавода (на прыканцы экскурсіі). |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Пераезд у вёску Стайкі (5 мінут– 4,6 км)** | | | | | | |
| Вёска Стайкі Двор “Стайкі” | Пляцоўка перад будынкамі. Двара “Стайкі” | Адноўленыя будынкі Двара “Стайкі” рода Багдановічаў герба “Багорыя” | 30 | Аглядная экскурсія - Двор “Стайкі” – помнік барока і класіцызму. Гісторыя радавога гнязда Багдановічаў, герба Багорыя. Першыя гаспадары Двара “Стайкі” і яго росквіт. Новае жыццё Двара “Стайкі”. | Экскурсію праводзіць экскурсавод (па дамоўленасці). Група размяшчаецца ў зале-жнасці ад размяшчэння аб’екта паказу | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, лакалізацыі падзей і гістарычных асоб. |
| **Пераезд у вёску Мацькаўцы (1,5 км -3 хвіліны)** | | | | | | |
| в. Мацькаў-цы | На збочыне дарогі | Водныя каналы, млын, стайня | 5 | Пабудовы рода Багдановічаў у канцы XIX — пачатку XX стагоддзя | Знешні агляд, не пакідаючы аўтобус | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, лакалізацыі падзей і гістарычных асоб. |
| На ўскраіне вёскі Мацькаў цы | На збочыне дарогі, с правага боку, 50 м | Прыдарожная каплічка | 5 | Каплічка была пабудавана ў 1920-ыя гады, унутры змешчана фігура Найсвяцейшай Панны Марыі. | Група размяшчаецца такім чынам, каб не ствараць перашкоды транспарту, які рухаецца. Правілы бяспечных паводзін. | Папярэдні агляд і аповед. |
| **Пераезд у вёску Старынкі (12 км, 16 хвілін)** | | | | | | |
| в. Старынкі | Пляцоўка ка | Сядзібны дом рода Багдано-вічаў, рэшткі алей сядзібнага парка | 15 | Легенда і факт набыцця маёнтка Старынкі. Аднаўленне маёнтка і стварэнне моцнай гаспадарчай інфраструктуры: пладовы сад, водная сістэма, вялізны гаспадарчы двор. Магчымасць рэстаўрацыі сядзі-бнага дома маёнтка Старынкі. | Група размяшчаецца перад парадным уваходам у сядзібны дом. Правілы бяспечных паводзін (немагчымасць наведвання пакояў дома). | Папярэдні агляд сядзібнага дома, пад’яздной брукаванай дарогі і рэштkaў парк.а Выкарыстанне ксера-копій фотаздымкаў былога сядзібнага дома і гаспадарчых пабудоў |
| **Пераезд у цэнтр верхавой язды «Двор Старынкі» (0,5 км, 3 хвіліны)** | | | | | | |
| Цэнтр верхавой | Пляцоўка перад | конная ферма | 30 | Розныя пароды коней, спартыўныя жарабцы. Можна | Экскурсію праводзіць інструктар. | Быць уважлівымі да парад інструктара. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| язды | комплекса м | | | пакарміць жывёл, а таксама пакатацца на конях. | | |
| **Пераезд у вёску Камена (12 км, 15 хвілін)** | | | | | | |
| В.Камена | Аўтобусны прыпынак, 100 м пяшком | Барысаў камень “Варацішын крыж” | 5 | Камень з ружовага граніту. Вышыня каменнага звону над паверхняй зямлі – 2,1м, даўжыня – 3,7 м, абвод –10.4 м, вага больш за 38 тон. Адкрыў помнік і ўпершыню замаляваў яго Канстанцін Тышкевіч у час навуковай экспедыцыі па рацэ Вілія | Група размяшчаецца паўкругам каля камня . | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі |
| **Пераезд у аграгарадок Даўгінава (7 км, 8 хвілін)** | | | | | | |
| Аг. Даўгінава | Стаянка перад царквой | Траецкая царква | 5 | Пабудавана ў 1870 годзе, цікавай архітэктурнай формы, упрыгожаная двума купаламі, з'яўляецца помнікам рэтраспектыўна-рускага стылю. | Група размяшчаецца паўкругам. | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі |
| | Стаянка на плошчы | Касцёл Святога Станіслава. | 20 | Знешні і ўнутраны агляд храма, знаёмства з будовай, з мастацтвам храма. Год пабудавання 1853. Інтэр’ер храма багата дэкарыраваны. Касцёл з’яўляецца важным архітэктурным помнікам, культурна-гістарычнай каштоўнасцю Беларусі. Ёсць дзеючы арган. | Экскурсію праводзіць святар па дамоўленасці | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі |
| | Пяшком 150 м в. Савецкая | Будынак былой сінагогі, мемарыяльны камень Змітраку Бядулі. | 7 | Да нашага часу захаваўся будынак сінагогі, у якой вучыўся знакаміты беларускі пісьменнік Змітрок Бядуля. | Група размяшчаецца паўкругам | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Праезд да канца в. Савецкай | Яўрэйскія могілкі | 10 | Побач са старымі яўрэйскімі могілкамі знаходзіцца адзіны захаваны ў Беларусі бейт-ахарон (хата абмыванняў).Тут перад пахаваннямі людзі з пахавальнага братэрства «Хэўра-Кадыша» абмывалі нябожчыка. | Група размяшчаецца ў залежнасці ад размяшчэння аб’екта паказу | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі |
| **Пераезд ў в. Крайск (14 км 17 хвілін)** | | | | | | |
| Крайск | Абочына дарогі | Капліца Свяціцеля Алексія. Святая крыніца | 5 | Каменная царква пабудавана ў гонар Свяціцеля Алексія Маскоўскага Цудатворца ў 1897 годзе на сродкі святара Аляксея Біруковіча, на месцы пахавання свайго бацькі Міхаіла Біруковіча. | Група размяшчаецца ў залежнасці ад размяшчэння аб’екта паказу | Спалучаць прыёмы гістарычнага аналізу, экскурсійнай даведкі. |
| в. Будзённага, 1 | Стаянка каля комплекса | Агратурыстычны комплекс “Райск”. | 30 | Унікальная калекцыя дэкаратыўных птушак. 20 відаў фазанаў, больш за 12 відаў паўлінаў, цэсарак, індыкоў. Цікавыя жывёлы: яноты, паласкуны, вавёркі, бурундукі, казулі. | Экскурсію праводзіць экскурсавод (па дамоўленасці). Група размяшчаецца перад вальерамі строга па пешаходных сцежках. Экскурсавод узгадвае аб уважлівых адносінах да сваіх рэчаў і развітаецца з экскурсантамі. | Выкарыстоўваць прыёмы паказа (папярэдні агляд і аповед) Прапанаваць членам групы пакінуць запіс аб уражанні ад экскурсіі ў журнале экскурсавода. |

| | |
|---|---|
|  |  |
| **Царква Свяціцеля Мікалая і Царскіх Пакутнікаў в.Крайск** | **Свята-Аляксееўская царква в. Крайск** |
|  |  |
| **Касцёл Адведзіны Найсвяцейшай панны Марыі, в.Альковічы** | **Сядзіба-паркавы комплекс Багдановічаў “Стаецкі двор”, в.Стайкі** |
|  |  |
| **Сядзібны дом маёнтка Багдановічаў ( 18 ст), в.Старынкі** | **Варацішын крыж у вёсцы Камена** |

| | |
|---|---|
|  |  |
| **Касцёл Святога Станіслава, в.Даўгінава** | **Траецкая царква в. Даўгінава** |
|  |  |
| **Яўрэйскія могілкі, в.Даўгінава** | **Могілкі часоў вайны 1912 года, в.Даўгінава** |
|  |  |
| **Будынак былой сінагогі, в.Даўгінава** | **Памятны знак З.Бядулі, в.Даўгінава** |